Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 18 (517). Вільня, Нядзеля 7 Траўня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Аб чым і як пісаць у газэты.

Магчыма, што не адзін з нашых чытачоў зьдзівіцца з гэткай тэмы. Аднак, калі бліжэй над ей задумаецца, згодзіцца з намі, што ведаць, аб чым пісаць у газэты і ведаць, як пісаць—справа ня так простая і ня так лёгкая, як часамі здаецца. Калі мы сабе добра ўцямім, што ў нашых сяньняшніх палітычных варунках газэта зьяўляецца, калі не адзіным, дык найважнейшым правадніком беларускай нацыянальнай сьведамасьці, дык сапраўды лёгка праканаемся, што трэба старанна думаць, каб у газэту пісаць рэчы сапраўды карысныя і патрэбныя і каб пісаць так, каб з напісанага была карысьць. А гэта ўсё тасуецца ня толькі да нашых вяскоўцаў, якія з пяром ня звыкшыся і для якіх пісаньне ў газэты сапраўды ёсьць рэчай ня лёгкай, але гэта ўсё тасуецца так-жа і да нашай інтэлігенцыі, якая часта з пяром абазнаная дужа добра, а якая пісаць у газэты аб такіх рэчах і пісаць так, каб з напісанага сапраўды была карысьць, не заўсёды можа.

Прадусім трэба ведаць, што няма ніякага сэнсу пісаць у газэты аб тых рэчах, якія ня маюць грамадзкага значэньня. Да гэткіх спраў належаць розныя справы чыста асабістыя. Нашай напрыклад рэдакцыі ведамыя і такія лісты, празначаныя як матэрыял у газэту, у якіх апісваліся дрэнныя паступкі жонкі аўтора, або аб тым, як сусед аўтора Сымон, напіўшыся на кірмашы гарэлкі, вярочаючыся дамоў, начаваў у рове, або ўзноў аб тым, як адзін селянін з суседняй вёскі, атрымаўшы па сьмерці дзядзькі амэрыканца ў спадку даляры, купіў за іх зямлю і збудаваў стройны дом.

Вось-жа гэткія справы і справы ім падобныя, як характару чыста асабістага, на тэмы для газэт не падходзяць. Аб гэтых справах, калі яны нядобрыя, няхай гавораць духоўнікі па цэрквах і касьцёлах. Газэты-ж існуюць па тое, каб у іх друкаваць тое ўсё, што датыча не чыста асабістых спраў, але грамадзкіх, спраў цікавых і важных ня толькі для адзінак, але прадусім для грамадзянства, для агулу. Разгледзім-жа хоць збольшага гэтыя грамадзкія справы папарадку.

Важнай грамадзкай справай ёсьць беларуская нацыянальная сьведамасьць па нашых сёлах. Справа гэта важная для ўсяго беларускага народу, бо ад народнай сьведамасьці нашага сяляніна залежа жыцьцё ўсяго нашага народу. Вось-жа сапраўды важным ёсьць пісаньне ў газэту аб тым, наскольні ў якой вёсцы, у якой ваколіцы, у якой гміне ці павеце ёсьць беларускай сьведамасьці, гэта знача, — ці людзі тамтэйшыя ведаюць аб тым, што яны не палякі і не расейцы, што спрыяе разьвіцьцю гэткай сьведамасьці, што ей перашкаджае і так далей.

Ня менш важнай грамадзкай тэмай у газэты ёсьць так-жа справа асьветы. Аб гэтай справе добра апісаць, ці існуе ў тым сяле, ці мястэчку, адкуль паходзіць аўтор, школа, якая гэта школа — польская, мяшаная, ці беларуская, добра ці блага вучаць у тэй школе, ці любяць дзеці школу, калі не, — дык чаму, чаго ў тэй школе вучаць апрача патрэбных прадметаў, як вучыцель школы адносіцца да беларускасьці, ці вядзецца якая асьвета беларуская пазашкольная і як яна вядзецца, ці выпісваюць тамтэйшыя сяляне беларускія газэты і якія, ці чытаюць беларускія кніжкі і якія, ці чытаюць у чужых мовах газэты, кніжкі і якія, што агулам найлепш любяць чытаць.

Дужа цікавым і карысным было-б такжа пісаньне ў газэты частае і праўдзівае аб палажэньні эканамічным нашай вёскі. Гэта знача аб тым, ці ёсьць коопэратыва ці не, калі не, — дык чаму, паскольні больш-менш сяляне маюць зямлі і як каму яе сусім мала, што той думае, чым спадзяецца сваю долю паправіць, ці ёсьць польскія асаднікі, як яны гаспадараць, як адносяцца да мясцовага беларускага насельніцтва, скольні іх ёсьць. Гэткія і ім падобныя тэмы з жыцьця эканамічнага нашай вёскі могуць быць сапраўды цікавым і цэнным матэрыялам у газэты.

А як-жа ўзноў цікавымі зьяўляюцца справы царкоўныя і касьцельныя! Дужа ўдзячнымі тэмамі былі-б справы аб тым, ці ў якой мясцовасьці на беларускай зямлі, ў царкве ці ў касьцеле, ёсьць беларускія казаньні ці не, як да гэтай справы адносіцца насельніцтва, духавенства, ці разумеюць сяляне, што ўжываньне ў сьвятынях нашых чужых: расейскай і польскай моваў— гэта ёсьць зьдзек над душой беларускай, што гэта выдумка чужацкай палітыкі; ці ахвотна людзі ходзяць у царкву, касьцёл, а калі не — дык чаму; як духавенства адносіцца да людзей, да беларускасьці; ці ў сьвятынях падчас казаньняў парушае справы палітычныя і якія, аб чым гавора з народам паза сьвятыняй у прыватных з ім гутарках...

Дужа карысным урэшце было-б пісаць у газэты аб тым, чым цікавіцца і што робіць вясковая моладзь, якія існуюць арганізацыі, якія да іх адносіны народу, як да беларусаў адносіцца польскае вучыцельства, паліцыя, урадаўцы, пошта і гэтак далей.

Вось на гэткія больш-менш тэмы і на розныя ім падобныя можна і трэба пісаць у газэты. Прычым пісаць трэба прадусім выразным пісьмом, пажадана на аднэй бачыне паперы, а таксама пісаць толькі праўду, ясна і проста выражаць думку. Калі-б гэтыя думкі аднак укладаліся няскладна — гэта нічога, ад таго існуе рэдакцыя, каб кожны рукапіс паправіла і думку ў ім упарадкавала.

Гэтыя нашыя ўвагі аднолькава адносяцца як да граматных сялян, да вясковых інтэлігентаў, так і да нашых поўных інтэлігентаў, якія яшчэ мала абазнаны з карысным і талковым пісаньнем у газэты.

Ясная рэч, што між пісаньнем сялян і поўінтэлігентаў з аднаго боку, а між пісаньнем інтэлігентаў мусіць заходзіць розьніца натуральная. Як адны так і другія могуць дый павінны пісаць між іншым і аб тым, аб чым мы вышэй згрубшага ўспомнілі, толькі калі неінтэлігенты могуць пісаць агулам і больш павярхоўна, інтэлігенты самыя штодзенныя праявы шэрага жыцьця беларускага народу павінны апісваць больш рачова, глыбей, з выказаньнем прычын і больш сыстэматычна.

На заканчэньне яшчэ раз паўтараем, што справа, аб чым і як пісаць у газэты, асабліва для нас беларусаў, гэта справа сапраўды вялікай вагі. Сяньня з тым толькі народам рахуюцца і той толькі народ лічаць за народ годны існаваньня, за маючы права існаваць, які аб сваім народным жыцьці, аб правох гэтага жыцьця голасна заяўляе. Трыбунай народнай, адкуль можа несьціся ў сьвет беларускі народны голас, ёсьць беларуская газэта, а ў Зах. Беларусі такой газэтай ёсьць покульшто адна „Беларуская Крыніца".

Астаецца толькі пажадаць, каб голас нашай часопісі, — дзякуючы як найшырэйшаму ў ей супрацоўніцтву граматнага сялянства і інтэлігенцыі, — ставаўся штораз грамчэйшым і што-раз жывейшым і каб „Бел. Крыніца" была верным люстрам паўнаты беларускага народнага жыцьця.

З жыцьця Літоўцаў.

† Кс. Казімер Праполяніс.

На другі дзень сёлетняга Вялікадня ў Незалежнай Літве, у Палонзе, памёр шырока ў сваім часе ведамы барацьбіт за правы літоўскага народу кс. Казімер Праполяніс.

Радзіўся 1858 г. у цяперашнім Марыямпальскім пав., у сяле Лаўцкема. Вучыўся ў Марыямпальскай гімназіі, у Варшаўскай і Пецярбурскай духоўнай сэмінарыі і ўрэшце ў Пецярбурскай Духоўнай Акадэміі, якую скончыў у 1885 г. з навуковым званьнем кандыдата багасловія. У тым-жа годзе быў пасьвячаны на ксяндза і назначаны сьпярша на памоцніка сэкрэтара, а пасьля на сэкрэтара Магілеўскага каталіцкага арцыбіскупа ў Пецярбурзе. На гэтым становішчы, пры розных арцыбіскупах, прабыў Праполяніс да 1904 г., адзначаючыся як здольны і выраблены дыплёмат.

Разам з абавязкамі сэкрэтара, нябожчык спаўняў так-жа абавязкі прэфэкта ў некалькіх гімназіях і ў сярэдніх школах ваенных. Быў так-жа ведамы як літоўскі народны і грамадзкі дзеяч. Ён шмат зрабіў дабра для літоўскай калёніі ў Пецярбурзе, асабліва много прычыніўся да таго, што ў некаторых пецярбурскіх касьцёлах былі заведзены літоўскія казаньні і літоўскія рэлігійныя песьні. Каз. Праполяніс, зразумелая рэч, дужа не падабаўся палякам і яны пастараліся пазбавіць яго становішча арцыбіскупскага сэкрэтара.

1904 г. ён асеў настала ў Сэйнах і шырока павёў літоўскую народную працу. Заложыў часопісь „Šaltinis" („Крыніца") і быў праз некаторы час яе рэдактарам.

1909 г. Праполяніс пераехаў у Коўну, дзе далей вёў народную працу, многа ўдзяляючы часу на барацьбу з польскімі атакамі на літоўскае адраджэньне.

Нябожчык многа так-жа працаваў над мінуўшчынай літоўскага народу. Як вынік гэтай яго працы была галосная ў сваім часе яго кніжка ў польскай мове: „Polskie Apostolstwo w Litwie", выданая ў Вільні ў 1913 г. Кніжка гэта ў польскім грамадзянстве была нарабіўшы шмат шуму, бо яна, апёршыся на гістарычных дадзеных, ува ўсей нагаце выказвала, што каталіцтва ў Літве і ў Беларусі на працягу вякоў служыла аружжам польскай палітыкі.

Пасьля, праз цэлы рад гадоў, Каз. Праполяніс прабываў у Рыме, дзе поўніў абавязкі неафіцыяльнага літоўскага прадстаўніка пры Ватыкане.

Калі паўстала незалежная Літва, Праполяніс вярнуўся ў Коўну і тут атрымаў даручэньне арганізаваць дэпартамэнт рэлігіяў. Але, узяўшыся за гэтыя абавязкі, хутка іх пакінуў з прычыны паважнага недамаганьня. Дзеля лячэньня пераехаў у Палонгу і тут, маючы 75 г., расстаўся з гэтым сьветам.

Усё жыцьцё сваё Праполяніс правёў у бязупыннай барацьбе за правы літоўскага народу, палажыўшы ў гэтым кірунку вялікія для Літвы заслугі.

Уся праца Праполяніса, асабліва-ж яго кніжка „Polskie Apostolstwo w Litwie", убочна мае даволі важнае значэньне і для беларускага адраджэньня, якое ён разумеў і якому спрыяў.

Дакумэнт дня.

Пад гэткім загалоўкам у № 32 „Viln. Rytojus" спатыкаем пісьмо да Віленскага Каталіцкага арцыбіскупа сяброў літоўцаў Сьвянцянскага Касьцельнага Камітэту. Асаблівы гэты дакумэнт падаём ніжэй даслоўна:

„2 красавіка 1933 г. Сьвянцянскі дзекан па казаньні з амбоны прачытаў склад управы Камітэту, у які ўваходзяць выключна палякі: п. п. А. Гузэ, В. Грыневіцкі, А. Блажэвіч і П. Пяткевіч.

Гэткае Вашай Эксцэленцыі назначэньне Камітэту зьдзівіла і загневала парафіян, бо наша парафія, за выняткам мяшчан і двароў, ёсьць літоўская. Ужо вялікай з боку літоўцаў было ўступкай, што яны згадзіліся выбраць нароўні: 7 літоўцаў і 7 палякоў. Гэта было зроблена дзеля сьвятога спакою. Ваша Эксцэленцыя, назначаючы Камітэт, літоўцаў абышоў, а назначыў выключна палякоў.

Вось-жа, дзеля гэткага староннага і несправядлівага пастулку, мы літсўцы, выбраныя сябры ў парафіяльны Касьцельны Камітэт, станоўча пратэстуем і дамагаемся справядлівага складу „Сьвянцянскага Парафіяльнага Камітэту". Далей ідуць подпісы сямёх літоўцаў, выбраных сяброў Камітэту.

Сапраўды, цікавы дакумэнт! Паказвае ён нам, як „пахрысьціянску" пасе сваіх авец літоўцаў арцыб. Ялбжыкоўскі.

Гэтак паступае ён з літоўцамі, а ўжо аб беларусах і гаварыць няма чаго.

Кастусь Сапежыц.

З беларускага жыцьця.

Звычайны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры адбудзецца ў нядзелю 7 траўня з наступным парадкам дня: 1) Справаздача, 2) Выбары Ураду і Рэвізыйнай Камісіі і 3) Плян працы на будучыню. — Пачатак а гадз. 16-тай.

Мітынг не адбыўся. У нядзелю 23.IV с. г. меўся адбыцца ў Ляхавічах, Баранавіцкага пав. беларускі мітынг — пасол Ярэміч меў даць справаздачу з пасольскай дзейнасьці. Адміністрацыйныя ўлады аднак веча гэта забаранілі.

„Шлях Моладзі", месячнік беларускай моладзі, за м-ц красавік, выйшаў з друку ў мінулым тыдні.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Арышт ксяндза-беларуса. Апошнімі часамі бальшавікі арыштавалі мусіць апошняга ўжо ксяндза-беларуса Я. Пяткевіча. — Кс. Я. Пяткевіч аж да гэтай пары ўмеў непаддацца ніякай правакацыі, ані якому падазрэньню бальшавікоў. Аднак-жа, відаць, бальшавікі знайшлі спосаб, каб аддзяліць ад народу ягонага пастыра.

З Польшчы.

Бюджэтны дэфіцыт за 1932-33 год. Афіцыяльны орган міністэрства промыслу і гандлю „Polska Gospodarcza" падае, што бюджэтныя выдаткі за 1932-33 год выносяць 2.244 мільёны зл., а даход 2.002 мільёны зл. У гэту суму даходаў уваходзіць і 70 мільёнаў зл. пазычкі з Банку Польскага. Адняўшы гэтую суму пазычкі, даход раўняецца суме 1.932 мільёнаў зл. Такім чынам сапраўды дэфіцыт дасягнуў сумы 312 мільёнаў.

Узрост пратэстаў вэксалёў. У сакавіку с. г. пачаўся ўсрост пратэстаў вэксалёў. Ва ўсей Польшчы запратэставана 181.7 тысяч вэксалёў на суму 39.6 мільёнаў зл.

Безрабоцьце. Паводле афіцыяльных статыстычных даных дня 22.IV с. г. у Польшчы было 263.060 безработных. Паводле падлічэньняў „Rabotnika" аднак безработных у Польшчы цяпер ёсьць больш мільёна асоб.

З заграніцы.

Ад вялікай прыязьні да варожасьці — Заляцанкі Саветаў да капіталістычных дзяржаў. Да найбольш цікавых падзеяў у міжнародным жыцьці апошніх часоў належыць аснаўны зварот нямецка-савецкіх суадносінаў. Пасьля нацыяналістычнай рэвалюцыі ў Нямеччыне, Саветы пачалі ад яе адварачвацца і зьвяртацца з сваей прыязьняй да Францыі і Польшчы. Польшч, быццам захоплена гэтым зваротам, шумна падгатаўляе чарговы пакт неагрэсіі між Малой Антантай і Саветамі.

Для Нямеччыны саюз з Саветамі ўжо адыграў сваю ролю: памаглі нямецкаму промыслу пратрываць цяжкія гады. Цяпер Саветы для Нямеччыны ўжо не патрэбны: не зьяўляюцпа вялікім рынкам збыту нямецкаму промыслу, а саюз з бальшавікамі шкодзіць ей у эўрапэйскай і міжнароднай палітыцы.

Сяньня бальшавікі апынуліся, як кажуць „выведзенымі ў поле." Нацыяналістычная рэвалюцыя ў Нямеччыне была для іх неспадзеўкай і сільным моральным ударам. Камуністычны ўрад СССР. упойваў веру ў масах у сілу рэвалюцыйна камуністычнага руху ў Нямеччыне. Капітуляцыя-ж камуністаў прад Гітлерам выявіла прад савецкімі грамадзянамі ўсю брахню ды няздарнасьць бальшавікоў у падгатоўцы так шумна і голасна абяцанай сусьветнай рэвалюцыі.

Словам, бальшавікі прад усім сьветам у палітычнай ігры з Нямеччынай сорамна праваліліся. Цяпер яны пачалі шахаваць Нямеччыну, робячы заляцанкі да Францыі і Польшчы. Стараюцца прылабуніцца і да капіталістычнай Амэрыкі. За ўсялякую цану стараюцца стаяць хоць аднэй нагой у Эўропе, адкуль выкідае іх цяпер Нямеччына. Апрача гэтага, шукаюць бальшавікі капіталу заграніцай на патрэбы нутраныя і каб заплаціць даўгі, якіх маюць больш 700 мільёнаў залатых рублёў, а далей—мусяць ратаваць думку аб сабе сярод савецкіх масаў і даказаць ім, што маюць давер і голас у сьвеце. Польшч і Малая Антанта гэнага крэдыту грашавога і моральнага, ім не дадуць. Хіба — Францыя і Амэрыка. Англія, сарваўшы гандлёвыя зносіны з СССР., пільнуецца, каб не рабіць надмерных выдаткаў бальшавіком, бо супольна з Італіяй і Нямеччынай, пляную новы капіталістычны канцэрн, без бальшавікоў. Амэрыка цікавіцца гэным канцэрнам больш чым бальшавікі, а Францыя пэўне пойдзе туды, дзе будзе лепшы інтэрас.

Пасьля нарады ў Вашынгтоне—Сусьветная конфэрэнцыя. Нядаўна адбылася ў Амэрыцы ў Вашынгтоне гаспадарчая нарада прадстаўнікоў вялікіх эўрапэйскіх дзяржаў з прэзыдэнтам Зл. Шт. Амэрыкі Рузвэльтам. Пасьля гэтай нарады мае адбыцца сусьветная гаспадарчая конфэрэнцыя, якая пачнецца 12 чэрвеня с. г. Гэна конфэрэнцыя мае адбыцца ў Англіі і на яе мае зьехацца 2.000 дэлегатаў ад 65 дзяржаваў.

Савецка-манджурскі канфлікт. З далёкага Ўсходу паведамляюць у Маскву, што японцы прыступаюць выганяць бальшавікоў з усх.-кітайскай чыгункі, каб захапіць яе ў свае рукі, перадаючы яе манджурскай дзяржаве.

У сувязі з гэтым канфліктам нямецкія газэты пішуць, што паўстане новы проціўбальшавіцкі фронт дзяржаў, на чале з Японіяй, з боку Далёкага Ўсходу.

З ВІЛЬНІ.

Узрост пратэстаў вэксалёў. У працягу мінулага м-ца заўважыўся вялікі ўзрост пратэстаў вэксалёў у Вільні і Віленшчыне. У сакавіку ў Віленскім ваяводзтве запратэставана 8.000 вэксалёў на суму 1.200.000 зл. З гэтай лічбы ў Вільні запратэставана 6.200 вэксалёў на суму мільёна зл.

Курс грашэй: Даляр захістаўся, золата йдзе ўверх. За даляр неахвотна плацяць ўсяго 7.-зл., а то і менш, а за рубель золатам—5.10 зл.

Прамова Кс. Др Я. Рэшэця

25.III.33 г. ў Касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні ў 15 ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

(Друкуем паводле стэнограмы).

Sursum corda!
У гару сэрцы!

ГРАМАДЗЯНЕ І БРАТЫ ДАРАГІЯ!

Сьвяткуем дзень нашага ідэалу народнага: Незалежнасьці Беларусі. Сьвяткуем, сьвяткаваць-жа—знача радавацца, цешыцца. Дзень нашага сьвята—дзень нашай радасьці. Сьвяткуем у пару веснавую, у пару прабуджэньня жыцьця пасьля доўгай зімы халоднай, сьвяткуем у дзень Маці Божай, дзень абвешчаньня сьвету, што насьпеў час і зьдзейсьніліся сны, лятуценьні, прароцтвы і Слова Божае целам сталася. Тымбольш узмагаеца настрой наш сьвяточны. Здаецца, што ўсё спрыяе той радасьці дня сяньняшняга.

А тымчасам ня ўсьпелі мы яшчэ выгаварыць гэнага цёплага слова „радасьць," як ужо чуем, што з боку сучасных абставін жыцьця нашага павеела вострым холадам іроніі. Радавацца, ды чым і з чаго?

Радавацца днём беларускага сьвята тады, калі гушчы народныя знаходзяцца ў няволі цемры і адчасьці сваей нясьведамасьці нацыянальнай?

Радавацца, калі бачым, як чужынец-сусед тую ніву закінутую нядоляй выкарыстывае дзеля сваіх уласных палітычных інтарэсаў?

Радавацца, калі тысячы і тысячы дзяцей беларускіх роднай прасьветы школьнай ня знаюць, калі столькі талентаў гіне, марнее, бо ім бедным няма-ж доступу ў сьвятыню навук вышэйшых?

Радавацца, калі чуем енкі агалеўшай вёскі, што млее пад цяжарам эканамічнага заняпаду? Радасьць,— ці-ж гэта ня горкая насьмешка долі над нашым сяньняшнім сьвятам? Як тут цешыцца, калі цёмная хмара, свае крыльлі распусьціўшы, наводзіць сум і жуду на сьвежа зарунелую ніву маладога жыцьця беларускага і калі ня чуваць віхраў і буры, што разагналі-б тыя туманы густыя, даючы доступ ясным і цёплым праменьням сонца?!

Яшчэ, на жаль, у радох самых сьведамых адзінак беларускіх, на плечы каторых гісторыя ўзлажыла паважны абавязак змаганьня за долю народу і там еднасьці думак і супрацоўніцтва ня бачым. Дык чым-жа ў канцы радавацца?

* * *

А ўсёжтакі мы сьвяткуем, усёжтакі мы цешымся, радуемся.

І вось наш перщы акт, першы пункт праграмы сьвяткаваньня—набажэнства ў касьцеле. Разважма характар нашай тутка прысутнасьці. Тут мы не на акадэміі, не на мітынгу: — мы ў касьцеле перад Богам-Тварцом сваім. Гэта ўявіць трэба нам кожнаму, калі форме нашых абыходаў адказаць мае лёгіка і сапраўдная дарэчнасьць жыцьцёвага зьместу і павагі. Сягоньняшні, кажам, дзень перш-на-перш сюды нас заклікаў і адазвалася з радасьцю душа нашая на кліч гэны: „Усьцешыўся я, калі мне сказалі: хадзем да дому Гасподняга!"

— „І вось нашы стопы стаяць у варотах тваіх, о Ерузаліме!"

Няхай-жа сьцены гэтай сьвятыні заслоняць на хвіліну нам жуду сучаснага палажэньня беларускага народу. Узнясём тут сэрцы свае ў гару — sursum corda! — у высь, там, дзе сьвеціць ясная зорка нашага ідэалу народнага і тут дайма свабоду душы нашай, няхай акрыліўшыся ўзляціць ў вышыню неба, няхай аддыхне там верай і надзеяй, няхай разрадуецца шчасьцем свайго ажыўленьня, а згэтуль няхай сапраўды і запачаткуем настрой свой сьвяточны дня сяньняшняга.

Штож-бо такое той ідэал, аб каторым, гаворым і як яго асягнуць, як яго здзейсьніць? Наш ідэал—гэта ня твор розуму людзкога, ня фікцыя, ня выдумка, не фантазія. Ідэал — гэта тая лінія, каторую накрэсьліў жыцьцю людзкому сам Тварэц—Бог, гэта тая форма, каторую Ён чалавеку празначыў, каб той выпаўніў яе развоем жыцьця свайго. Адпаведна да сваіх ідэалаў натура людзкая абдарана адумысловымі здольнасьцямі, імкненьнем і пажаданьнем да іх асягненьня. Гэтак, як грудзі прагнуць паветра, як галодны—ежы, так істота людзкая, як разумная і вольная — сваіх высокіх ідэалаў прыродных.

Неабходным варункам зьяўляецца тут чалавеку патрэба асабістай незалежнасьці, свабоды. Тады толькі думаць можна аб належным развою жыцьця людзкога паводле накрэсьленых Тварцом ліній—ідэалаў. Інакш наступіць паралiжаваньне жыцьця, яго калечаньне. Гэтае дамаганьне свабоды аказваецца асабліва магутным у жыцьці грамадзкім, народным. Народны арганізм мае свае мэты, свае ідэалы і дзеля гэтага, як твор жывы, імпульсам усяе свае натуры прагне і дамагаецца свабоды, як канечнага, неабходнага варунку нармальнага жыцьця свайго. Тую свабоду, незалежнасьць роднага краю, лічым сваім ідэалам найвышэйшым у тым значэньні, што без яго жыцьцё зьвязана і мець ня будзе паўнаты свайго развою, ды яно можа навет зусім загаснуць, народ можа загінуць. Без свабоды ўдарэмняюцца ўсе скарбы натуры нашай, без свабоды народ ідзе да скону. І як страшная сьмерць, а любае жыцьцё, так гарачым ёсьць пажаданьне незалежнасьці палітычнай.

Як-жа-ж тую незалежнасьць паднявольны народ здабыць і ўтрымаць можа? Стацца гэта можа дваякім спосабам. Можа здарыцца, што вонкавая сіла, каторая накінула пу-

АБ ГАСПАДАРЦЫ.

СОЯ.

Апошнім часам у землябробскіх кругох шмат шуму нарабіла справа гадаваньня соі. Варта дзеля гэтага зазнаёміцца з ёй і нам, дзеля самай хоць-бы арыентацыі, а для не аднаго можа і — самастойнай спробы.

Соя гэта матыльковая (стручковая) расьціна, ведамая ў Кітаю і наагул на Далёкім Усходзе ўжо прад 5.000 гадамі. Яна вельмі плодная і спажыўна: у добрых варунках адно зерне дае 100 і больш такіх-жа зярнят, багатых на бялкі і тук. Працэнт бялкоў у соі дасягае 40. Дзеля гэтага з зярняці соі вырабляецца высокавартасны алей, які замяняе масла. Наагул-жа з зярняці соі можна прыгатаўляць самыя рознародныя стравы, якія, памінаючы сваю высокую спажыўную якасьць, адзначаюцца і сваею таннасьцю.

Соя мае вельмі шмат сартоў. Для нашых зах.-беларускіх земляў ад 1925 г. быў гадаваны асобны сорт рудой, вельмі ранний соі (Early brown). Расьце соя на кожным грунце, абы ня быў ён толькі за вільготны і гліясты. Пяскі-сухавеі для соі таксама не падходзяць. Глеба аднак мусіць быць чыстая ад рознага пустазельля (пырнік і інш.). Сьвежага гнаеньня соя ня любіць і найлепш удаецца на другой, а то і трэцей гнойнай сіле, напр. пасьля бульбы.

Сеецца, або садзіцца, соя ў нашым клімаце не пазьней 20 мая, прымаразкаў не баіцца. Найлепш садзіць сою ў радкі, аддаленыя ад сябе на 40 см., а ў радку адно каліва ад другога таксама на якіх 30—40 см.

Пры ўсіх добрых уласьцівасьцях соі, ня можна забывацца і аб тым, што еінае зерне вельмі хутка траціць сілу прарастаньня, асабліва-ж калі было перахоўвана ў вогкіх і цёплых мясцох. Радзяць дзеля гэтага пры ручным саджэньні соі ў адну ямку — зробленую калочкам ці пальцам — садзіць 2—3 зярняты: калі абойдуць абодва, тады можна адно каліва перасадзіць туды, дзе не абышло ніводнае, а то і сусім выкінуць. — Другой нявыгодай у соі ёсьць тое, што яна на сьвежым для сябе грунце можа і сусём не абыйсьці, і гэта не дзеля ўтраты сілы прарастаньня, а дзеля таго, што на сьвежым для сябе становішчы ня знойдзе адпавядаючых сабе бактэрыяў. Гэта самае, як ведама, здараецца і з сэрадэляй. Тут няма іншай рады, як шчапіць зямлю пажаданымі бактэрыямі. У практычы гэткае прышчэпліваньне адбываецца так, што, або зерне соі прад пасевам скрапліваецца растворам, у каторым ёсьць гэтыя бактэрыі, або на полі, гдзе мае быць соя сеена, растрасаецца ў пахмурны дзень, ці прад ноччу, крыха зямлі з таго поля, гдзе соя ўжо расла. — Усё гэта наказвае землябробу пры новым засеіваньні соі быць вельмі асьцярожным і пачынаць разводзіць яе з малога толькі мноства. — Садзіцца соя ў глыбкі на 2—3 см.

Прарастае соя па 10 (больш-менш) днёх пры тэмпэратуры ня ніжэй 12^0C, хоць разьвіваецца толькі ад 15^0C уверх. Каб прысьпяшыць усход соі пры спозьненым высаджваньні, яе прад самым высаджваньнем мочаць у вадзе праз 10—12 гадзін часу.

За 30 дзён пасьля прарашчэньня соя ўжо цьвіе а за тры месяцы звычайна ўжо поўнасьцю дасьпявае.

А. К.

Гаспадарчыя весткі.

Гаспадарчая бязглуздзіца. Для паднясьця цаны бразылійскія гандлёвыя фірмы ў 1932 годзе спалілі каля 2 мільёнаў кілёграмаў кавы. Цана аднак не паднялася.

У Аўстраліі закапалі ў зямлю восем тысяч авец, каб паднясь цану на мяса і воўну. Цана таксама не паднялася.

У Чэхаславаччыне мноства агуркоў утапілі ў Дунай, бо за вываз заграніцу трэба было плаціць вялікі налог. — Аднак цэны на ўсе гэтыя прадукты не падняліся.

Да нас пішуць.

„Nie przyjmuję do wiadomości", — сьвяткаваньне 25 сакавіка.

в. Валяўка, Наваградзкага пав. Як пісалася ўжо у „Бел. Крыніцы" раней, ані ў Валяўцы, ані у Мондзіне сарганізаваць Кола Беларускай Моладзі не ўдалося, бо староста прыслаў адказ, што „założenia Koła w Mondzinie nie przyjmuję do wiadomości i zakazuję powtórnego zakładania". Падставай гэтага ёсьць 14 арт. новае ўставы, каторы кажа, што ўлады могуць не дазволіць залажыць арганізацыі „należycie umotywowaną decyzją". Разумеецца, ніякіх матываў не пададзена..

Ня маючы арганізацыйных рамаў, наша моладзь сабралася 25 сакавіка і, замест Акадэміі, сьведамейшыя сябры выясьнілі павагу дня, дарагога для кожнага Беларуса. Вытваруыся паважна-ўрачысты настрой, адпаведны да ўрачыстай хвілі. — Гэтак мы саматугам сьвяткавалі наша нацыянальнае сьвята.

Дратва.

Сьвяткаваньне юбілею 25.III.18 у Гуртку БІГіК у Мядзьведзічах, Баранавіцкага пав.

Дзень 25-га сакавіка с. г. сябры гуртка БІГіК у Мядзьведзічах пастанавілі разам з усім сьведамым грамадзянствам адсьвяткаваць, як 15-тыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі. Сьвяткаваньне адбылося вельмі скромна, бо толькі ў рамках Гуртка. На сьвяткаваньне прышлі ўсе сябры Гуртка, за выняткам толькі пары асоб, каторыя ня ведама чаго баяліся супольна сьвяткаваць наша Народнае Сьвята. Праграма сьвяткаваньня аграпічылася толькі да прачытаньня перадавога артыкулу з „Б. Крыніцы" аб акце 25.III.18 г. Па прачытаньні газэты адзін з сяброў прадэклямаваў пару вершаў, а потым вялася далей вольная гутарка аб акце абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

Хоць сьвяткаваньне было неафіцыяльнае, аднак не абышлося без паліцыянтаў, каторыя падганялі сяброў, каб скарэй кончылі, бо ім есьці хочацца. Трэба сказаць, што паліцыя нямі вельмі апякуецца: зьяўляецца нават тады, калі ў гуртку нічога няма. Трэба таксама сказаць, што нашыя паліцыянты вельмі спасьцерагаўчыя, бо не пазволілі вывесіць над хатай беларускі нацыянальны сьцяг.

Дарагія браточкі! Ідзём сьмела і вытрывала наперад, выкарыстоўвайма кожную аказію, каб пашыраць і закараняць сьведамасьць і патрыятызм у беларускім народзе. Ад малых сьвят дойдзем некалі і да вялікіх, і да больш урачыстых.

М. Т.

З краю.

Закупы коняў для войска. У найбліжэйшым часе назначаны гэткія зборныя пункты дзеля закупу коняў для войска: у Вільні — 15 траўня, у Глыбокім — 16 траўня, у Сьвянцянах — 17 траўня, у Баранавічах — 18 траўня, у Гародзеі — 19 траўня, у Скрыбаўцах — 12 чэрвеня, у Лідзе — 13 чэрвеня, у Багданаве — 14 чэрвеня і ў Ашмяне — 20 і 21 чэрвеня. — На кожным такім зборным пункце трэба быць ужо ў 7 гадз. рана, каб атрымаць нумарок, каторы пазьней не выдаецца і без каторага каня ня будуць разглядаць. Пры кожным кані мусіць быць парцяны кантар

ты няволі, аслабне, а тады народ выходзіць на свабоду і стаецца незалежным. Гэта бывае пры розных катаклізмах, палітычных пераваротах: войнах, рэвалюцыях. Вось і нашаму народу спрыялі абставіны, падзеі палітычнага перавароту ў Расеі ў 1917—1918 гадах і 25.III.18г. даўся чуць голас прадстаўнікоў Беларускага краю: мы вольныя, мы ня хочам чужацкай апекі над сабою! Мы абвяшчаем свой край Незалежнай Рэспублікай Беларускай, мы гаспадары ў сваім доме народным, давол і над намі чужацкай дзяржаўнасьці!

Але той голас, той кліч незалежнасьці, хоць і пралясеў ён іскрай электрычнай у народзе, астаўся ўсёжткі адным гукам, адною думкай. Жорсткія абставіны не пазволілі яму быць сапраўдным варункам развою жыцьця народнага.Кажам, жорсткія абставіны, але, прызнаёмся, гэта-ж ня ўсё, мы ўнутранна ў сабе былі тады слабымі, мы да асягненьня незалежнасьці ня чуліся яшчэ прыгатаванымі. Магчыма, што і цяпер прыдуць новыя катаклізмы, палітычныя перавароты і магчыма, што ў зьвязку з гэтым факт незалежнасьці нашай станецца бадай ужо дакананым, але скажам сабе шчыра, ці мо' ўзноў не аднясе нас фаля абставін на ўзбуранае мора няпэўнасьці і адных лятуценьняў? А дзеля чаго — дзеля слабасьці нашай?

Вось чаму зьвернем увагу на другі спосаб здабыцьця незалежнасьці, на нармальны развой унутранага жыцьця свайго народнага. Народ, што ня жыве рэальна, цэлыщца незалежнасьцю ня будзе. Праўда, ня маючы незалежнасьці, бывае падчас немагчыма тое спаўніць нават у дробных размерах, усёжткі, на сколькі падазваюцца вонкавыя абставіны і сіла ўнутранай энэргіі, ўзмагайма-ж жыцьцё народнае! Не маем фактычнай незалежнасьці, але яна будзе, бо мы жывём, а жывучы натуральна яе дамагаемся, тым больш, калі ў тым кірунку кладзём пазытыўныя вартасьці жыцьцёвыя. Праўда, уклад гэных вартасьцяў будзе мо' невялічкі, але забывацца ня трэба, што ўзрост арганічны адбываецца наагул вельмі спакойна, якбы зусім і незаметна. Так і тутка,— узрасьцём, ды так магутна, што дамаганьне незалежнасьці станецца паважным голасам, з якім пачнуць людзі рахавацца. Тады момант гістарычных пераваротаў калі-б уламыў у рукі нашыя незалежнасьць народную, мы яе ўжо так скора ня выпусьцім; тая незалежнасьць ня будзе нам тады пустою формай, бо мы ўнясём у яе свой зьмест жыцьцёвы.

* * *

На асягненьні незалежнасьці і ўтрыманьні яе не канчаецца імкненьне жыцьця нашага народнага, хоць мы незалежнасьць і завём сваім найвышэйшым ідэалам народным. Незалежнасьць дасьць нам толькі магчымасьць жыць, разьвівацца ды зьдзейсьніць тыя ідэалы, тую мэту, якую Тварэц празначыў кожнаму народу. У незалежнасьці пры актыўнай працы маем будаваць дом свой народны, дом культуры сваей беларускай.

Дом будаваць, але паводле якіх ліній укладаць маем матэрыял будаўляны? Наш дом народны ўжо збуданы даўно адвекаў і прыгожая яго будыніна казаўбы магла-б быць сфатаграфаванай. Як-жа гэта разумець? А так, яшчэ напрыклад сьвятыня не пачала будавацца, а ўжо архітэкт паказывае нам усім яго структуру. Скуль ён той нарыс, тую фатаграфію бярэ? З галавы, з думак сваіх: бо там творыцца, там будуецца сьвятыня ідэальная. І дом наш народны—ён у думках Бога-Тварца нашага ў ідэальных лініях даўно, адвекаў ужо накрэсьлены. Паводле тых ліній нам трэба падводзіць уклад свой жыцьцёвы.Тады і сапраўднасьць нашая будзе так-жа стройнай,як і яеідэал.Калі-ж збудуем не паводле накрэсьленых ліній ідэальных—будыніна доўга ня ўстоіць, ня вытрымае напору, зваліцца.

Але дзе-ж тыя лініі, дзе тая структура ідэальная дому нашага народнага? Адказ будзе адзін праўдзівы: Бог-Тварэц аб'явіў нам яе празСына свайго—Хрыста. І дзеля гэтага ідэолёгія хрысьціянская ёсьць адзінай асноваі, цьвёрдым гранітным падкладам жыцьця нашага.

І тут во скрываецца оптымізм наш народны. Наш ідэал — гэта Божы ідэал, мы цярпім, але Ён з намі, мы змагаемся і пераможам, бо ў Ём сіла і апора нашая. Вось дзе радасьць дня сяньняшняга. Мы свой ідэал народны бачым у вечных асновах Тварца-Бога, мы да яго імкнёмся паводле ліній Імжа паказаных і сваю сілу жыцьцёвую з таеж крыніцы чэрпаць маем. Надзея нашая спачывае і апіраецца не на фантастычных уявах нейкага хворага романтызму народнага, але на найбольш пэўных, цьвёрдых, выразных лініях, каторыя падкладае сам Бог пад нашае жыцьцё народнае. Гэта мы ўявіць сабе жадаема ў памятным дні нашага сьвяткаваньня тутка сабраўшыся ў сьвятыні перад Богам-Тварцом народаў.

* * *

Багаслаў-жа, Божа, сьвяткаваньне нашае, бо гэтым адначасна павялічаем мудрасьць Тваю прадвечную і славім Твой Огляд Боскі над народамі. Ад Цябе мы залежны больш, як праменьні ад сонца, бо Ты нашая альфа і омэга (пачатак і канец) і дзеля гэтага ўручаем Табе свае пераджываньні, свае імкненьні, свае ідэалы народныя. Яны зрадзіліся ў мудрасьці Тваей і Тваей творчай волі, будзь-жа, Божа, нашай пуцьцяводнай зоркай, нашай сілай, падмогай!

Тады выкрасім з жыцьця свайго вялікія думкі, слаўныя чыны, фактычны сыпнём хвалу Табе, сябе-ж самых паставім у рад народаў вольных і шчасьлівых!

Nr.7. STUDENSKAJA TRYBUNA 7.V.1933.

Nie dzialicca a łučycca!

Biełaruskaje studenstva niejak asabliva zrazumieła i starajecca pravodzić u žyćcio pravila „dyfferencyjacyi“ dumak. Heta asablivaść tym dziŭniejšaja, što hetkaj tyja, chto sami ŭdajuć adkinutych i pakryŭdžanych, chto „ŭ imia spraviadlivaści“ damahajecca „demokratyčnaj roŭnapraŭnaści“, žadaje, kab niechta rachavaŭsia z jahonaj „dumkaj“, — usie hetyja „abaroncy spraviadlivaści“ ŭvažajuć za poŭnapraŭnych čamuści tolki siabie samych. U adnošańni-ž da ŭsiakaha, chto dumaje jnakš, jany zdradžajuć despotyzm, za katory nie pastydałasia-b i najčarniejšaja reakcyja. „Paradki“ ŭ Uschodniaj Biełarusi paćviardžajuć heta całkom. A ŭ nas, u Biełarusi Zachodniaj, dzie hetyja „abaroncy“ ŭłady nia majuć, apetytami svaimi jany ničuć nie adstali: „upłyvami“ chacieli-b dasiahnuć usiudy, ale konkretna pryłažycca da pracy, nieści jejny ciažar i być za hetu pracu adkaznymi — niama kamu. U rezultacie — jość kamu „ŭładać“, ale niama kamu pracavać i sprava staić na miejscy.

Nie vyhladaje, kab heta sprava mieła papravicca i na najbližejšuju budučyniu. Tyja ž „abaroncy spraviadlivaści“ ćvierdziać adnak, što „kali maje być Biełaruś z niesocyjalistyčnaj budovaj, dyk chaj lepš jaje zusim nia budzie“.

Minajučy susiom tut vartaść socyjalistyčnaj doktryny, jak takoj, treba zaznačyć, što kali kožny biełarus budzie siańnia stavić svaje damahańni z hetkaj-ža ćviordaściu, dyk nia budzie taho, chto-b hetyja damahańni zachacieŭ hvarantavać, nia budzie taho, chto b dla spravy biełaruskaj zachacieŭ pracavać. Zabaŭlacca siahońnia biełarusam u hetkija ultymatyŭnyja pažadańni, heta toje samaje, što stavić piečy i viešać darahija abrazy pad adkrytym niebam: budujučy chatu pierš treba kłaści fundament, uznosić ścieny, kryć strachu i paśla dumać ab drobiaziach nutranaj abstanoŭki. — I nam, biełarusam, kali chočam budavać svoj narodny Dom — Biełaruś, treba pieradusim zhodna i sumiesna pracavać nad zakładzinami fundamentaŭ, nad raźvićciom našaj nacyjanalnaj kultury, našaj haspadarki...

A jak heta ŭžo budziem mieć, tady nia trudna budzie i naš Dom vykančyć usiaredzinie. Da hetaha-ž času chaj nichto nia śmieje admaŭlacca ad pracy ahulnaj, bo heta było-b na ruku tolki našym niepryjacielam, a ab nas samych tolki ŭćvierdziłasia-b pierakanańnie, što my da pracy nia ŭmiejem uziacca.

Dyk nie dzialicca nam treba, ale najciaśniej z saboj łučycca!

Važnaja patreba.

Biełaruskaje studenstva ŭ bolšaści svajej — heta typovaje pradstaŭnictva sialanstva. Pachodziačy z jaho nietraŭ, z vioski, znaje detalna roznarodnyja prajavy i varunki sialanskaha žyćcia, materjalnyja i duchovyja intaresy, stan kultury i haspadarki sielanina, jaho palityčnyja aspiracyi i nastroi. Adnym słovam studentbiełarus — heta žyvaja encyklopedyja sialanstva, z jakoha jon pachodzić. Adnak redka mnohim z takich encyklopedystaŭ prychodzić na dumku z ahulna paraŭnać žyćcio biełaruskaha sielanina z žyćciom takoj-ža socyjalnaj klasy inšych narodaŭ, pieradusim zachodnia-eŭropejskich. Paraŭnańnie takoje vypała-b na niekaryść biełarusa-sielanina ŭ tym sensie, što jon daloka astaŭsia z-zadu u cyvilizacyjnym i kulturalnym postupie inšych narodaŭ.

Biełaruskaje sialanstva, kali voźmiem haspadarčuju staranu jaho žyćcia — ziemlarobskuju kulturu—daloka znachodzicca z-zadu ad stanu i raźvićcia takoj-ža ziemlarobskaj kultury takich narodaŭ, jak švajcarskaha, českaha, belhijskaha, niamieckaha i inš.

Dumajučy student i ahułam intelihient znojdzie pryčynu takoha stanu rečaŭ, takoha zaniadbańnia i adstałaści ŭ sielskaj haspadarcy našaha narodu pradusim u kolkisotletnim socyjalnym i palityčnym, a što za tym idzie — kulturnym i ekonomičnym paniavoleńni hetaha narodu čužnikami.

Paraŭnaŭčy ahlad žyćcia biełaruskaha sialanstva i žyćcia takoj ža socyjalnaj klasy inšych narodaŭ zrodzić ni ŭ adnaho idejovaha ahladčyka impulsy i žadańni padniać na vyšyniu kultury rodnaje sialanstva.

Ale nie adzin z studentaŭ skaža, što trudna być kožnamu „Jurkam“ z biełaruskaha narodnaha tancu, — usio ŭmieć: być stalarom, šaŭcom, kavalom i t. d., — adnym słovam stacca ŭniversalistam; — što takaja praca naleža da specyjalistaŭ, a kali hutarka ab sielskaj haspadarcy, — da ahranomaŭ;—nia kožny student biełarus pavinien hetym cikavicca, aproč chiba taho, chto specyjalna na ŭniversytecie ci ŭ inšaj škole ahranomiju studjuje i navukova ŭjaŭlaje hetuju halinu pracy i žyćcia.

Taki pahlad pa-našamu nie znachodzić apraŭdańnia ŭ stanoviščy biełaruskaha studenta, jakoje jon pavinien zaniać da svajho narodu ahułam, a da sialanstva ŭ asobnaści. Šyrokaje zrazumieńnie narodnych abaviazkaŭ imienna nakazvaje studentu abznajomicca z elementarnaj viedaj ab sielska-haspadarčym žyćci. Kali znachodzić naš student čas na čytańnie, časta pustoj, beletrystyčnaj literatury, ci nia lepš heny čas vykarystać dla viedy praz čytańnie literatury ab sielskaj haspadarcy. Nia budučy specyjalistam, inžynieram-ahranomam, abo jakim fachovym instruktaram, kožny student ačytany ŭ ahranamičnaj i popularnaj literatury (u formie fachovych časopisiaŭ, kalendaroŭ, monohrafijaŭ i inšych publikacyjaŭ viedy z haliny sielskaj haspadarki) moža stacca nie apošnim samaadukavanym instruktaram dla našaj vioski i adyhryvać udziačnuju rolu pijanera ahrarnaj kultury, dziela stvareńnia materjalnaha dabrabytu i ekanamičnych padstaŭ našaha narodnaha adradžeńnia.

Na žal observacyja žyćcia našaha studenstva šmat kaho pierakonyvaje, što nie adzin z studentaŭ budučy padčas śviatočnych ci letnich kanikułaŭ doma — na vioscy — adyhryvaje rolu „panka“, pasyŭnaha observatara, jakoha prablemy sielska-haspadarčaha žyćcia mała, a to i zusim nie interesujuć — zamiest być aktyŭnym instruktaram i daradčykam sialanstva ŭ spravie pabudovy racyjanalnaj systemy viačzieńnia i eksploatacyi sielskaj haspadarki, zamiest być budzicielem siarod sialanstva zainteresavańniaŭ kulturnaha viadzieńnia haspadarki.

Peŭniež nie vymahajecca ad takoha studenta pracy fizyčnaj u haspadarcy, chiba tolki — ŭ kaho doma stvarylisia takija abstaviny, jakija zmušajuć da hetaha, ale možna vymahać ad studenta pijonerstva ahranamičnaj kultury, jasna ŭ miežach mahčymaści.

Reasumujučy vyšejskazanaje, treba śćvierdzić z naciskam vialikuju i palučuju patrebu zainteresavańnia i prysvajeńnia praktyčnaj viedy ab sielskaj haspadarcy našym studenstvam, patrebu pašyreńnia hetaje viedy siarod sialanstva, kab hetym samym padniać apošniaje na vyšyniu cyvilizavanaha i kulturnaha sialanstva inšych krajoŭ i dziaržaŭ, a samomu studenstvu hetkim čynam stacca vartasnym i karysnym u hramadzkaj pracy siarod svajho narodu.

Pracujma na vioscy!

Siało naša zbudziłasia.

U vočy pieradusim kidajecca cichaja, ale rašučaja baraćba rodnaj biełaruskaj kultury z kulturaj i ŭpłyvami čužackimi.

Śviedamaść narodnaja našaj vioski ŭzmacniajecca z kožnym dniom: najmienšaja knižačka, brašurka, kali čytaču jość dastupnaja, robić ahramadny ŭpłyŭ. Viaskovy intelihient, jaki zdolny dumać ab hramadzkich spravach, nie starajecca siahońnia navučycca kiardekać papolsku, jak heta robiać u nas roznyja niedapioki, a pasłuhoŭvajecca tolki movaj biełaru kaj, vypisvaje i pašyraje biełaruskije hazety i knižki, vučycca biełaruskich pieśniaŭ, słovam stanovicca ŭ rady narodnych pioneraŭ aśviety. Typy sa starejšaj heneracyi, uzhadavanyja ŭ duchu ksiandzoŭska-polskim, abo papoŭska-maskoŭskim vymirajuć.

Praŭda i siahońnia zdarajecca spatkać maładziona, jakoha ksiond-palak uciahnuŭ u koła polskaj moładzi i jaki, pad upłyvam endeckich basiań, na't da rodnaj matki havora papolsku, ale heta pieravažna ludzi ahraničanyja i tupałobyja. Z hetkich tolki śmiajucca ŭ siale. Devotki „polskiej wiary“ jašče daŭžejšy čas pieratryvajuć na Biełarusi. Dumajučaja naša moładź užo akreśliła svaje adnosiny da relihii, da ksiandza i da svajej narodnaści. Adnak jość jašče tut i ciemry.

U palityčnaj dumcy, choć i jość značny razbrod, adnak pieramahaje kirunak poŭnaj niazaležnaści Biełarusi i supracoŭnictva z narodami, jakija ŭ padobnych abstavinach znachodziacca, a imienna: Ukraincami i Litoŭcami.

Rola, jakuju moža student adyhrać uva ŭsich hetych kvestyjach, jość ahromnaja. Naviazvajučy łučnaść z cichimi pracaŭnikami na vioscy, my ŭskraplajem ich na duchu, służam im svajej radaj i navukaj, možam akazać svaju pomač ci to robiačy adčyty, ci pamahajučy arhanizavać biełaruskija arhanizacyi, ci vučačy biełaruskije pieśni. I toj z nas, chto važnaść hetaha ŭsiaho razumieje i budzie tak pracavać, toj sapraŭdy jość karysnym pracaŭnikom na rodnaj nivie. Bo baraćba ŭ nas niaroŭnaja: z adnaje starany vystupaje ŭ baraćbie za dušu biel. moładzi polskaje vučycielstva, roznyja ŭradoŭcy, polskaje duchavienstva, a na't maskoŭskaje, a z druhoj starany — pa-ćiuŭnaha boku — baroniać hetu moładź lepšyja adzinki z pasiarod jaje, ludzi ad sachi i płuha(!).

Dyk da pracy, kalehi studenty! Čym aktyŭniej vystupim my suproć ciemry i škodnych čužych upłyvaŭ, tym bolš udziačnaja nam budzie viaskovaja moładź i tym bližej my budziem svaich niezaležnickich idealaŭ.

J. M.

VAM...

Vy latucieńnie pakaleńniaŭ,
Pomsta kryŭdy, sprawiadlivy hnieŭ,
Vy ahniaćviet siarod sucieńniaŭ,
Vaš znak — krylaty leŭ.
Vam zorny šlach zbudovany rukami
Ludziej abudžanych da znańnia.
A vašych kryllaŭ sonny ŭzmach
Prahryz dušu iržoju sumlavańnia.
Vam pravadyrski dadzien ściah,
A dzie ciapier jon pavivaje?
Dzie była radaść, ciapier žach,
Ci-ž čyrvień maja — adćvitaje?
Davierra hušćaŭ vam
Addali my u ruki,
A za zdradu i abman
Kaho-ž praklanuć ŭnuki?
Maŭčy duša. Spynisia žal!
Sudzić ci-ž maładaści prava?
Mianie-ž hniacie strašny ciažar,
A kroŭ kipić jak lava.
Nam pravadyr ciapier patrebny
Z dušoj jarčejšaj za vahoń.
Jamu hatoŭ ŭžo pancyr srebny
I miеč i ščyt i borzdy koń.
Ciapier śviet padobny burałomu:
Kipić ŭvieś — prahaju vajny
I pry vodhałasach hromu
Irvucca ŭ boj „dvuhłavyja arły“.
A my dla ich iznoŭ zdabyčaj
O hańba! Soram ŭ hetki čas
Nia mieć ludziej, što mocnym kličam
Mahli nas ŭsich ŭ hramadu abjadnać.
Tak! Chaj pryjdzie novy Kalinoŭski,
Jaho paviesiać, my-ž zmaŭčym.
Prykład žyvy ŭ niadaŭnym prošłym
O! chto prabačyć hety čyn.
Złožanaść žyćcia, splacieńnie źjavaŭ
Kirujecca zakonam vynikaŭ pryčyn,
A my šukajem i čakajem čaraŭ,
Kab z imhly paŭstaŭ hartoŭnaj voli syn.

Jury Narač.

Redakcyjnaja Kalehija „Studenskaj Trybuny“ — u składzie kal. kal.: M. Tatarynovičanka, J. Šutovič i J. Malecki
Sekretaryjat „Stud. Trybuny“ čynny kožnuju niadzielu miž 11—12 hadz. pry vul. Ludvisarskaj 1—19.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.